**Спіс крыніц**

1. Беларусы: Сучасныя этнакультурныя працэсы [Тэкст] / Г. І. Каспяровіч [і інш.]; рэдкал.: А. І. Лакотка [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы. — Мн.: Беларус. навука, 2009. — 607 с.:іл.

2. Беларусы. Т.6. Грамадскія традыцыі [Тэкст] / В. Ф. Бацяеў, В.М. Бялявіна, А. У. Гурко і інш.; Рэдкал.: В. М. Бялявіна і інш.; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. — Мн.: Бел. навука, 2002. — 606с.,іл.

3. Социальная сфера. Культура. Официальный сайт Гомельского райисполкома. [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://www.gomel.gomel-region.by/ru/society/culture — 14.01.2011 г. — Загл. с экрана.

4. *Пашковская, Г.* По жизни с книгой [Тэкст] / Г. Пашковская // Маяк. Газета Гомельскага раённага выканаўчага камітэта, Гомельскага раённага Савета дэпутатаў. — 2010. — 15 верасня. — 2 с.

5. Архіў аўтара. Палявы сшытак № 4. Палявое этнаграфічнае даследаванне па тэме: "Прафесійныя святы ў Гомельскім раёне ў другой палове XX – пачатку XXI ст.: гісторыка-этнаграфічная характарыстыка". — 12 арк.

***Т. В. Каржан***
*Навуковы кіраўнік — А. У. Літвінскі*
Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт,
г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь

# АСОБА МІНДОЎГА Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

У артыкуле разглядаецца пытанне аб інтэрпрэтацыі ў сучаснай беларускай навуцы гістарычнай ролі вялікага князя Літоўскага, а потым і караля Літвы Міндоўга. Актуальнасць дадзенага пытання абумоўлена дыскусійным характарам праблемы ўтварэння ВКЛ. Таму вельмі важна высветліць ролю той альбо іншай асобы ў супярэчлівым працэсе станаўлення балта-славянскай дзяржавы. Дадзеная праблема недастаткова даследавана ў беларускай гістарыяграфіі, і яе разгляд можа ўзбагаціць веды аб нашай мінуўшчыне новай інфармацыяй.

Мэтай даследавання з'яўляецца высвятленне пазіцый сучасных беларускіх гісторыкаў па пытанні ацэнкі значэння дзейнасці Міндоўга. Задачы даследавання прадугледжваюць параўнанне поглядаў беларускіх навукоўцаў канца XX — пачатку XXI стагоддзя на асобу гэтага князя, што можна зрабіць у працэсе аналізу зместа іх прац. Даследаванне грунтуецца на метадалагічных прынцыпах аб'ектыўнасці і гістарызму. У якасці асноўнага метаду выбраны параўнальна-гістарычны метад.

Гісторыкі згаджаюцца ў тым, што Міндоўг паходзіў з арыстакратычнага роду, вядомага ў гістарычнай Літве, і належыў, паводле тэкста пагаднення Літвы з Галіцка-Валынскім княствам, заключанага ў 1219 годзе, да «старэйшых» князёў [1, с. 66; 3, с. 135; 4, с. 60]. На думку М. Ермаловіча, звесткі гістарычных крыніц пра Міндоўга (да часу яго з'яўлення ў Навагрудку) «характарызуюць яго выключна як наёмніка» [2, с. 65]. Іншыя гісторыкі не акцэнтуюць на гэтым факце ўвагі.

Навукоўцы па-рознаму адказвалі і адказваюць на пытанне, як і чаму дзесьці ў 40-х гадах XIII стагоддзя Міндоўг з'явіўся ў Навагрудку. Літоўскія гісторыкі сцвярджаюць, што ён захапіў горад. Але існуюць і іншыя версіі. Недахоп інфармацыі гістарычных крыніц вымушае выказваць больш альбо менш праўдападобныя здагадкі. Менавіта М. Ермаловіч паслядоўна адстойваў погляд на Міндоўга як на перабежчыка з Літвы, дзе яго становішча пахіснулася пасля паражэння ад крыжакоў пад Амботэнам, на Навагрудскую зямлю, дзе яго прынялі ў якасці ўцекача [2, с. 65—68]. Іншыя даследчыкі не лічаць Міндоўга ўцекачом, які мусіў прасіць падтрымкі ў жыхароў Навагрудка. На думку А. Краўцэвіча, пачаткам існавання ВКЛ стаў палітычны саюз паміж Міндоўгам і кіруючымі коламі Навагрудка, пры гэтым немагчыма з дакладнасцю ўстанавіць, які з бакоў быў ініцыятарам [3, с. 127–128]. Яшчэ больш асцярожны ў выказваннях В. Насевіч. Ён лічыць, што «на аснове наяўных фактаў немагчыма высветліць, якім чынам Наваградак перайшоў пад уладу літоўскага князя» [1, с. 73]. У цэлым пазіцыю сучасных беларускіх гісторыкаў наконт з'яўлення Міндоўга ў Навагрудку можна перадаць наступнымі словамі Г. Сагановіча: «Хутчэй за ўсё, Міндоўг тут быў абвешчаны князем са згоды мясцовага насельніцтва» [4, с. 61].

Адноснае паразуменне сярод беларускіх гісторыкаў дасягнута па пытанні аб месцы каранацыі Міндоўга: гэтым месцам стаў Навагрудак [1, с. 74; 2, с. 72; 4, с. 62]. Як адзначае Г. Сагановіч, «улетку 1253 года ў Наваградку адбылася ўрачыстая каранацыя Міндоўга. У вачах хрысціянскай Еўропы гэты акт адразу ўзносіў Літву ў ранг каралеўства, якім лічылася вялікая і незалежная дзяржава» [4, с. 62]. Гэтай цырымоніі папярэднічала хрышчэнне Міндоўга па каталіцкім абрадзе, якое, магчыма, таксама адбылося ў Навагрудку [3, с. 141]. Дадзеныя падзеі сталі вынікам збліжэння князя з Лівонскім Ордэнам. Большасць сучасных беларускіх навукоўцаў лічыць гэтае збліжэнне выдатным дыпламатычным ходам Міндоўга, паколькі такім чынам была разбурана антылітоўская кааліцыя. Адваротнай думкі прытрымліваўся М. Ермаловіч. З яго пункту гледжання, гэты манеўр Міндоўга нічога не даў ні самаму палітыку, ні Навагрудку, паколькі не спыніў галіцка-валынскія вайсковыя экспедыцыі на тэрыторыю Панямоння [2, с. 75].

Як вядома, каля 1260 года Міндоўг парваў з каталіцтвам, вярнуўшыся ў язычніцтва. Беларускія гісторыкі адзначаюць гэты факт, аднак падрабязна яго не каменціруюць. Падкрэсліваецца, што нягледзячы на гэта, у пачатку 60-х гадоў XIII стагоддзя князь дасягнуў, паводле Валынскага летапісу, неабмежаванай улады [1, с. 76].

Жыццё і палітычная кар'ера Міндоўга абарваліся трагічна: ён каля 1263 года быў забіты разам з двума сынамі ў выніку змовы нальшчанскага князя Даўмонта, які помсціў яму за адабраную жонку, і ўласных пляменнікаў Таўцівіла і Траняты, якія імкнуліся да ўлады ў нядаўна створанай дзяржаве. Даследчыкі канстатуюць, што і паводзіны Міндоўга, і паводзіны яго забойцаў былі характэрныя для Сярэднявечча, калі нават родныя сувязі не рабіліся перашкодай для праяў жорсткасці [3, с. 147—148]. Ускосна аб значэнні асобы Мендоўга ў маладой дзяржаве сведчыць той факт, што пасля яго гвалтоўнай гібелі пачаўся ўнутраны палітычны крызіс, які доўжыўся прыкладна да 1270 года [3, с. 147—150].

Такім чынам, у сучаснай беларускай гістарычнай навуцы відавочна выявіліся два пункты гледжання на асобу Міндоўга і яго ролю ў гісторыі ВКЛ. Першы з іх паслядоўна адстойваў М. Ермаловіч. «Роля Міндоўга ў гісторыі яўна перабольшваецца. Ён фактычна не быў стваральнікам ВКЛ. <...> Ён больш прыстасоўваўся да адпаведных умоў, чым сам іх ствараў», — сцвярджаў даследчык [2, с. 75–76]. Такое стаўленне да Міндоўга занадта крытычнае.

Аднак у сучаснай гістарыяграфіі пераважае іншая думка. Паводле яе досыць высока ацэньваецца талент Міндоўга як палітыка і яго ўклад у працэс утварэння і станаўлення ВКЛ. Як мяркуе В. Насевіч, галоўным вынікам палітычнай дзейнасці Міндоўга было «ўтварэнне з сярэдзіны XIII стагоддзя даволі ўстойлівай палітычнай структуры, у якой вярхоўнаму князю літоўскага паходжання непасрэдна належала частка этнічнай Літвы (Аўкштота) з Наваградскай зямлёй, а іншыя балцкія (Жамойць) і рускія (Полацкае княства) землі знаходзіліся ў пэўнай залежнасці ад яго. Гэта дазваляла эфектыўна супрацьдзейнічаць экспансіі, з аднаго боку, крыжакаў, з другога — татар і залежных ад іх галіцка-валынскіх князёў. У барацьбе з крыжакамі вялікі князь мог апірацца на рускія княствы, а ў барацьбе з татарамі і валынянамі — на этнічную Літву» [1, с. 75]. Стварэнне такой даволі трывалай дзяржаўнай структуры — мабыць, галоўная заслуга Міндоўга як гістарычнага дзеяча.

Міндоўг з'яўляецца легендарнай асобай беларускай мінуўшчыны. Ён шмат зрабіў дзеля станаўлення Вялікага Княства Літоўскага, у склад якога ўваходзілі і землі сучаснай Беларусі. На жаль, не шмат вядома пра жыццё і дзейнасць першага караля ў гісторыі Вялікага Княства Літоўскага, аднак і таго, што мы ведаем, дастаткова, каб належным чынам падкрэсліць яго значны ўклад ва ўмацаванне гэтай дзяржавы.

**Спіс крыніц**


1. Гісторыя Беларусі: У 6 т. : Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага / Ю. Бохан [і інш.]; рэд. кал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.] — Мінск : Экаперспектыва, 2008. — Т. 2 — 688с.;іл.
2. *Ермаловіч, М.* Беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае / М. Ермаловіч. — Мн.: "Белліт-фонд", 2000. — 448 с.
3. *Краўцэвіч, А. К.* Стварэнне Вялікага Княства Літоўскага / А. К. Краўцэвіч. — Беласток: ВШПА ім. С. Сташыца, 2008. — 196 с.
4. *Сагановіч, Г.* Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст. / Г. Сагановіч. – Мінск: "Энцыклапедыкс", 2001. — 412 с.



***А. В. Куель***
*Навуковы кіраўнік — Г. Г. Вашчылка*
Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт,
г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь


## ЯЗЫЧНІЦКАЯ І ХРЫСЦІЯНСКАЯ ТРАДЫЦЫІ Ў БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

Актуальнасць дадзенага даследваня ў тым, што культурная спадчына з'яўляецца важнай формай, у якой ілюстроўваецца пераемнасць у гістарычным развіцці грамадства. Улік дасягненняў папярэдніх эпох павінен спрыяць гарманічнаму выхаванню сучаснага грамадзяніна.

Мэта даследвання — прааналізаваць узаемаўплыў язычніцкіх і хрысціянскіх элементаў у беларускай культуры. У сувязі з гэтым вырашаюцца наступныя задачы: вызначыць узаемасвязі каляндарных свят і абрадаў з прыродным асяроддзем; паказаць уплыў хрысціянства на традыцыйныя святы беларусаў.

Пры даследванні тэмы выкарыстоўваліся спецыяльныя гістарычныя метады (гісторыка-параўнальны, гісторыка-тыпалагічны); агульнанавуковыя метады даследавання (параўнанне, абагульненне і інш.).

Традыцыі кожнага народа складаюцца вякамі, тысячагоддзямі і перадаюцца з пакалення ў пакаленне як неад'емная частка ўкладу жыцця чалавека. Каляндарныя святы і абрады беларусаў выразна падпарадкаваны гадавому вітку Зямлі вакол Сонца, калі апошняе дае веснавы росквіт прыродзе і замарожвае яго надоўга восенню, каб адрадзіць для новага кола жыцця наступнай вясной. Свята — найвышэйшы ўзровень развіцця духоўнай культуры, адпаведны стану душы чалавека ў тую ці іншую пару года ці ў тым або іншым узросце [4, с. 7]. Свята, як стан душы, ствараецца шматлікімі прысвяткамі, пастамі, падрыхтоўкай да яго фізічна, духоўна і эстэтычна [2, с. 23]. Графічная выява структуры беларускага народнага календара з яго васьмю асноўнымі святамі адразу ж высвечвае супадзенне з добра знаёмым фрагментам узораў на нашых саматканых ручніках, посцілках, арнаменце, вышытым на народным адзенні [5, с. 19].